**Урок беларускай мовы ў 4 класе**

**Тэма: Канчаткі прыметнікаў у творным, месным склонах**

Мэта: -пазнаёміць з супадзеннем форм творнага і меснага склонаў мужчынскага і ніякага роду прыметнікаў;
-паназіраць за залежнасцю канчатка ад тыпу асновы.

Задачы: вучыць утвараць формы творнага і меснага склонаў мужчынскага і ніякага роду прыметнікаў, вызначаць склон прыметнікаў па пытаннях, канчатках і склоне назоўніка, які паясняецца прыметнікам. Узбагачаць слоўнік навучэнцаў прыказкамі, прыметнікамі-антонімамі, развіваць арфаграфічную пільнасць, граматычны лад маўлення. Выхоўваць культуру маўлення.

Ход урока

I. **Арганізацыйны момант**

…Дык шануй , беларус, сваю мову-
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!

- Навошта трэба вывучаць беларускую мову?
-

II. **Праверка дамашняга задання**

– Прачытайце словазлучэнні прыметнік+ назоўнік у давальным склоне і назавіце род і канчаткі гэтых прыметнікаў.

III. **Арфаграфічная хвілінка**

(па картка) –Выбрать і запісаць словазлучэнні з прыметнікам. Адзін рад – у давальным склоне, другі рад- у родным склоне. У прыметнікаў абазначыць род і канчаткі.

IV. **Хвілінка чыстапісання**

Адгадванне загадкі: ***“Румяны Пілíп да галінкі прыліп”***

-Колькі значэнняў мае слова ***яблык***? (**Яблык** – плод яблыні; **вочны яблык** – шарападобнае цела вока; **адамаў яблык** – кадык.)

- Якое значэнне маюць выразы:

**-яблыку няма дзе ўпасці (**цесната, шматлюднасць**)**

**-яблык разладу** (прычына сваркі)

**-яблык ад яблыні далёка не падае** (у дзецях паўтараюцца рысы характару іх бацькоў)

- Гульня “Пошук”
  У слове ЯБЛЫК гэта літара абазначае два гукі
  Я я Яя Яб яб ял  Ян

- Падбярыце роднасныя словы
  Яблык, яблычак, яблычны.

## Фізкульхвілінка для вачэй

**V.Мэтаматывацыйны этап**

Даведаемся … *(якія канчаткі маюць прыметнікі ў творным і месным склонах*)

Навучымся …*( правільна пісаць канчаткі прыметнікаў адзіночнага ліку, творнага і меснага склонаў, вызначаць прыметнікі ў творным і месным склонах у сказах, словазлучэннях.)*

**VI. Вывучэнне новай тэмы**

Работа па падручніку

1.Работа са скарагаворкамі Пр.26 ( канчаткі прыметнікаў ў творным склоне)

(каля дошкі)-Выпісаць словазлучэнні “прым.+ наз.”

2.Работа з прыказкамі Пр. 27 ( канчаткі прыметнікаў у месным склоне)

(каля дошкі)-Выпісаць словазлучэнні “прым.+ наз.”

3. Рубрыка “Завяжы вузялок”

# Фізкультхвілінка

4. Самастойная работа Пр.28  Праверка “ланцужком”

**VII. Замацаванне вывучанага**

1. Дапаўненне сказаў прыметнікамі з супрацьлеглым значэннем. Пр. 29 (вусна)

2. Рубрыка “Гавары правільна”

3. Выбраць правільнае выказванне Пр. 30 (вусна)

**VIII.Дамашняе заданне Пр. 31**

**IX.Падвядзенне вынікаў**

-На якія пытанні адказваюць прыметнікі мужчынскага і ніякага роду у творным і месным склонах? (якім?)

-Якія канчаткі маюць? (-ым, -ім)

(Выстаўленне адзнак)

**Рэфлексія**